УДК 94(470)"18/19":272

# СТАН ДЫЯЦЭЗІЯЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**Асіпцова Яраслава Аляксандраўна**
Мсціслаўскі раённы гісторыка-археалагічны музей (г. Мсціслаў, Беларусь)

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці станаўлення дыяцэзіяльнай структуры рымска-каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя.*

У першай палове XIX стагоддзя на тэрыторыі Расійскай імперыі функцыянавала 12 дыяцэзій: Віленская, Мінская, Камянецкая, Цяльшэўская, Луцка-Жытомірская, Ціраспальская, Аўгустоўская, Калішская, Келецкая, Плоцкая, Люблінская, Сандамірская і 2 архідыяцэзіі (Магілёўская і Варшаўская) [2, с. 128–130].

Вялікі ўплыў на становішча Каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі, у тым ліку на яго структуру, аказала студзеньскае паўстанне 1863–1864 гг. з прычыны ўдзелу каталіцкага духавенства. Пасля падзей 1863–1864 гг. з боку ўрада Расійскай імперыі ўжываўся шэраг абмежаванняў адміністрацыйна-прымусовага характару да каталіцкага духавенства, адбыліся змены ў адносінах з Ватыканам. Так, у 1866 годзе імператар Аляксандр II выдаў указ аб разрыве Канкардату 1847 г., а таксама адбылося спыненне дыпламатычных адносін паміж Расійскай імперыяй і Апостальскай сталіцай [5, s. 157].

Акрамя таго, антыкаталіцкія меры закранулі і структуру рымска-каталіцкага касцёла. Так, у 1866 годзе была скасаваная Камянецкая дыяцэзія, а яе парафіі ўвайшлі ў склад Луцка-Жытомірскай дыяцэзіі. У 1867 годзе ўзнікла прапанова скасаваць і Мінскую дыяцэзію. 29 ліпеня 1869 г. адбылося скасаванне Мінскай дыяцэзіі, а яе парафіі ўвайшлі ў склад Віленскай дыяцэзіі. Прычым, у 1874 г. дзеючым Папам Рымскім у сілу бясспрэчнасці дзеяння булы "Universalis Ecclesiae cura" 1848 г., было абвешчана несапраўднай юрысдыкцыя Віленскай дыяцэзіі ў дачыненні да Мінскай. У сваю чаргу, Мінская і Камянецкая дыяцэзіі атрымалі статус апостальскіх адміністрацый [5, s. 128–129].

У 1878 годзе адбылося абранне Папы Рымскага – Льва XIII, які ажыццяўляў палітыку, атрымаўшую назву "дазвол і звязванне". Абранне новага пантыфіка з'яўляўлялась важным крокам ва ўзаемаадносінах паміж урадам Расійскай імперыяй і Апостальскай сталіцай. Так, у 1880 г. пачаліся перамовы аб лёсе Мінскай дыяцэзіі. З боку Апостальскай сталіцы быў прапанаваны праект аднаўлення дыяцэзіі, але ён быў адхілены. Вынікам перамоў стаў кампраміс – далучэнне парафій Мінскай дыяцэзіі да Магілёўскай архідыяцэзіі. Дадзенае рашэнне было выклікана падабенствам маральна-рэлігійнага жыцця вернікаў Мінскай дыяцэзіі не столькі з Віленскай дыяцэзіяй, колькі з Магілёўскай архідыяцэзіяй. У 1882 г. Мінская дыяцэзія стала часткай Магілёўскай архідыяцэзіі, а ў 1883 г. рымска-каталіцкія касцёлы Мінскай губерні даручаліся пад кіраванне арцыбіскупа магілёўскага А. Гінтаўта.

Указ "Аб умацаванні пачаткаў верацяпімасці" ад 17 красавіка 1905 г. адыграў важную ролю ў рэлігійным жыцці Расійскай імперыі. У гэты час пачаліся прапановы праектаў, накіраваных на змяненне арганізацыйнай структуры Каталіцкага касцёла і яго кіравання. Усе праекты разглядаліся ў Міністэрстве ўнутраных спраў і Дэпартаменце духоўных спраў замежных веравызнанняў Расійскай імперыі. Так, каталіцкі клір прапанаваў праект, які знайшоў адлюстраванне ў праграме Канстуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (чацвёртая глава). Клір, напрыклад, прапаноўваў знішчэнне рымска-каталіцкай духоўнай калегіі, права свабоднага дыялогу з папскім прастолам, абранне біскупаў згодна з кананічным правам рымска-каталіцкай царквы і г.д. Аднак праект быў адхілены [6, s. 8–9]. Акрамя гэтага, разглядаліся такія праекты як:

1) праект скасавання Віленскай дыяцэзіі. Дадзеная прапанова была выклікана тым, што дыяцэзія з'яўлялася цэнтрам антыўрадавых ідэй і выступленняў (лістападаўскае паўстанне 1830–1831 гг., студзеньскае паўстанне 1863–1864 гг.). Па праекту планавалася далучыць парафіі Віленскай губерні да Цяльшэўскай дыяцэзіі, а гродзенскія парафіі да Луцка-Жытомірскай дыяцэзіі. Аднак гэта не сустрэла падтрымкі з боку імператарскага прадстаўніка пры Св. Прастоле, які



Электронный архив библиотеки имени А. Кулешова

лічыў гэты крок незаконным. У сваю чаргу, у Ватыкане пачалі ўзнікаць сумневы наконт свабоды веравызнання ў Расійскай імперыі. У сувязі з гэтым, праект быў адхілены, паколькі скасаванне дыяцэзіі прывядзе да ўзнікнення праблем для ўраду Расійскай імперыі;

2) праект рэфармавання Магілёўскай рымска-каталіцкай архідыяцэзіі. Справа ў тым, што ў падпарадкаванні архідыяцэзіі мелася агромная колькасць парафій з каталіцкім насельніцтвам, якое было аддзелена ад касцёлаў вялікай адлегласцю, што абцяжарвала ажыццяўляць культавыя мерапрыемствы. Так, арцыбіскуп магілёўскі В. Ключынскі прапанаваў падзяліць Магілёўскую рымска-каталіцкую архідыяцэзію на 3 самастойныя дыяцэзіі: для беларусаў, ліфляндскіх і курляндскіх латышоў, і для азіяцкай часткі Расіі, альбо прызначыць беларускага, латышскага і сібірскага суфрагана пры мітрапаліце магілёўскім. Праект не быў рэалізаваны;

3) праект аднаўлення Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі. Праект не сустрэў падтрымкі сярод расійскіх чыноўнікаў. Прычым, Міністэрства ўнутраных спраў было вымушана прызнаць, што Мінская дыяцэзія кананічна ніколі не была скасавана і працягвала існаваць з ведама ўраду [1, с. 76–77].

Напапярэдадні Першай сусветнай вайны ў Расійскай імперыі налічвалася 5 мільёнаў каталікоў, 4500 касцёлаў і 1158 парафій, 2 архідыяцэзіі і 10 дыяцэзій. У сваю чаргу, на беларускіх землях, у склад Віленскай дыяцэзіі ўваходзіла 278 парафій і 36 філій, а на яе тэрыторыі пражывала 1 392 341 каталікоў і служыла 535 ксяндзоў [5, s. 672]. У склад Магілёўскай рымска-каталіцкай архідыяцэзіі, у 1914 годзе, ўваходзіла 214 парафій, 13 філій, а на яе тэрыторыі пражывалі 867000 каталікоў і служыла 370 ксяндзоў [3, с. 19; 5, s. 680].

Такім чынам, ўдзел каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863–1864 гг. паўплываў на становішча Каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыіі. Была праведзена рэарганізацыя дыяцэзіяльнай структуры касцёла. У выніку грамадска-палітычных падзей пачатку XX стагоддзя быў узяты курс на лібералізацыю рэлігійнага заканадаўства, што спрыяла актывізацыі дзейнасці Каталіцкага касцёла, аднак гэта істотна не паўплывала на дыяцэзіяльную структуру.

## Літаратура


1. Ганчар, А. И. Административно-территориальное деление Римско-католической церкви в Российской империи: планы и реалии / А. И. Ганчар // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2019. – № 1. – С. 76–85.

2. Пожарский, К. История Римско-Католической Церкви в Российской Империи (XVIII–XX вв.) в документах Российского государственного исторического архива / Федер. арх. служба России. Рос. гос. ист. Архив. – СПб.; Варшава : РГИА, 1999. – 289 с.

3. Ярмусик, Э.С. Католический Костёл в Белоруссии в годы второй мировой войны (1939–1945 гг.) : Монография / Э. С. Ярмусик. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 240 с.

4. Krzysztof Grygajtis. Kosciol katolicki w Rosji i w ZSRR w XIX i XX wieku. Doktrynalne uwarunkowania jego działalnosci / Krzysztof Grygajtis // History of Church(es), History of Law, Politics and religion, 19th Century, Pre-WW I & WW I (1900–1919), Interwar Period (1920–1939), WW II and following years (1940–1949), Post-War period (1950–1989), Canon Law. Church Law. – Krakow, 2006. – S. 155–200.

5. Kumor, B. Ustroj i organizacja Kosciola polskiego w okresie niewoli narodowej. 1772–1918 / B. Kumor. – Krakow : Polskie Tow-wo Teologiczne, 1980. – 700 s.

6. Program Stronnictwa Konstytucyjno-Katolickiego na Litwe i Białorus / inicyator Edward Ropp. – Wilno : Drukarnia Edmunda Nowickiego, 1906. – 16 s.